# Мапа абнаўляецца.

Лістуйце нам

на **radiosvaboda@gmail.com**

**Выданьне Радыё Свабода**
Укладаньне **Павал Дзюсекаў**
Фота **Уладзь Грыдзін**
Дызайн **Вера Перагудава**
Каардынатар **Франак Вячорка**

## ЯК ДАБРАЦЦА:

**Мэтро Пушкінская**, альбо прыпынак грамадзкага транспарту **Прытыцкага**
**Адрас:** Менск, Фрунзенскі раён, Кальварыйскія могілкі.
**Час працы:** летам 8.00-21.00, зімой 8.00-19.00




## ПРА КАЛЬВАРЫЮ



**Кальварыйскія могілкі** – найстарэйшыя сярод захаваных у Менску. Заснаваньне менскай Кальварыі не акрэсьліваецца канкрэтным годам, праз тое і ўзьнікла легенда, якая цьвердзіць, што могілкам і касьцёлу — 600 гадоў.

Слова **Calvaria** лацінскага паходжаньня, азначае тое самае, што і Гальгота (гэта старажытнагрэцкае слова арамэйскага паходжаньня) – месца, дзе быў укрыжаваны **Ісус Хрыстос**. У перакладзе ж гэта верхняя частка чэрапа або – у пераносным значэньні – Лысая гара, як такія пагоркі звычайна завуцца і ў нас. Калі на гары ставілі храм, людзі падымаліся да яго, як Хрыстос – да Гальготы (Кальварыі).

## ПАДАНЬНІ ПРА КАЛЬВАРЫЮ

Ну і якія ж могілкі без паданьняў? Згодна першаму крыж на касьцёле – гэта зьберажоны крыж касьцёлу Дамініканаў. Сам касьцёл стаяў ля сучаснага Палацу Рэспублікі, узарваны ў 1950 г. з прычыны ўсталяваньня на плошчы помніка Сталіну. А крыж вернікі захавалі – і ў выніку з 1980 г. крыж упрыгожвае Кальварыйскую сьвятыню.



Згодна з другім паданьнем на Кальвары ёсьць свой прывід. Легенда пра **Белую Панну Кальварыі** кажа: "У канцы XIX стагодзьдзя позна ўвосень памерла маладая паненка. Пахаваць яе вырашылі на Кальварыйскіх могілках. Паклалі ў труну, адпелі, замуравалі у склепе. Але паненка не памерла, а заснула летаргічным сном. Прачнуўшыся, дзяўчына так і не змагла выбрацца з закалочанай труны і ў пакутах загінула. З той пары яе прывід у позьнія лістападаўскія ночы цягам стагодзьдзя блукаў па могілках. Прывід зьнік толькі пасьля таго, як вандалы зруйнавалі склеп. Хаця дагэтуль некаторыя паўночнікі, што гуляюць ля могілак, сьцьвярджаюць, што бачылі дзіўную белую постаць, якая блукала між магілак…"



РАДЫЁ СВАБОДА ПРЭЗЭНТУЕ:

# МАПА БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ НЭКРОПАЛЬ

## КАЛЬВАРЫЙСКІЯ МОГІЛКІ

# ГІСТОРЫЯ МОГІЛАК

Пісаная гісторыя могілак пачынаецца ў 1745 годзе. У Лідзе на капітуле ордэну кармэлітаў менскі канвэнт ордэну атрымаў дазвол заснаваць Кальварыю – мэмарыял у памяць Хрыстовых пакутаў. Магчыма, ужо тады быў збудаваны першы драўляны касьцёл, тут адбываліся пахаваньні знакамітай шляхты. У 1796 г. атрыманы дазвол на пахаваньне простых гараджанаў.



**Кляштар кармэлітаў у Лідзе**

У 1800 годзе, ужо пасьля захопу Менску Расеяй, біскуп **Якуб Ігнат Дадэрка** передаў Кальварыйскі касьцёл францішканам. У 1836 годзе менская шляхта дамаглася дазволу збудаваць на месцы драўлянага касьцёлу мураваны. Будавалі ў 1839—1841 гадох на сродкі мясцовых жыхароў, галоўным фундатарам лічыцца **Ганна з Абуховічаў Паўлікоўская**. Новы псэўдагатычны касьцёл Узвышэньня Сьвятога Крыжа, асьвячоны ў 1842 годзе, стаў ужо парафіяльным, гэта значыць не належаў манаскаму ордэну, а групаваў вакол сябе касьцёльную грамаду. Расьпісаў касьцёл вялікі мастак **Ян Дамель**, ён пахаваны пад галоўным аўтаром храму. Перад пачаткам Другой усясьветнай вайны касьцёл быў зачынены савецкімі ўладамі. Дзейнічаў падчас вайны. Пасьля вайны прастаяў зачыненым 35 год, выкарыстоўваўся як склад, майстэрні, а людзі маліліся ля каплічак справа ад касьцёлу.

У 1980 годзе з нагоды Алімпійскіх гульняў храм быў адчынены для вернікаў першым зь менскіх касьцёлаў. Настаяцелем прызначылі **а. Яна Адамовіча.** У 1989—1990 гадах тут служыў **а. Уладыслаў Завальнюк**, які шмат зрабіў для ўпарадкаваньня могілак.

11 сакавіка 1989 г. у Кальварыйскім касьцёле **а. Аляксандар Надсан** адслужыў першую за 150 гадоў публічную каталіцкую службу ў бізантыйскім абрадзе – па-беларуску. Гэты дзень лічыцца пачаткам адраджэньня рэлігійнага і малітоўнага жыцьця грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі.



З 1991 году тут працаваў **а. Альбэрт Масальскі**, з 1994 году – пробашч касьцёлу. Ён нарадзіўся ў Менску (арцыбіскуп **Масальскі** з гэтага ж роду), ахрысьцілі яго ў Кальварыйскім касьцёле ў 1936 г.

У савецкі час могілкі руйнаваліся. У 1920—1930-я гады зьнішчаліся фамільныя пахаваньні, склепы. З магілаў зрывалі крыжы як чужыя краіне сярпа і молата сымбалі. У 1960—1970-я – другая хваля зьбіцьця крыжоў з помнікаў. Помнікі выварочвалі, зьнішчалі фатаздымкі на іх.

Могілкі закрылі для новых пахаваньняў у 1967 годзе, аднак згодна з заканадаўствам пры наяўнасьці санітарна-тэхнічных умоваў было магчымае пахаваньне побач з раней памерлымі блізкімі й сваякамі. У 1980-я гады на Кальварыі шукалі золата, раскопваючы старыя магілы. У 1990 годзе рашэньнем Менскага гарадскога выканаўчага камітэту комплекс усіх збудаваньняў разам з пахаваньнямі ўключаны ў дзяржаўны сьпіс помнікаў горадабудаўніцтва і архітэктуры Менску. Але і ў 1990-я гады вандалізм не мінуў Кальварыю: на Дзяды 1995 году было разбурана каля 50 помнікаў. У 1997 годзе быў атрыманы дазвол Менгарвыканкаму на новыя камэрцыйныя пахаваньні, была зьнішчаная "Аўстрыйская горка". Пад бульдозэр трапіла больш за 2000 старых пахаваньняў, у тым ліку княжны Юзэфы Патоцкай, знакамітага шляхціча Жыдовіча.

У 2001 годзе Кальварыйскія могілкі атрымалі статус гісторыка-культурнай каштоўнасьці першай катэгорыі як аб'ект міжнароднага значэньня.

# АРХІТЭКТУРА

Вельмі цікавая архітэктура Кальварыі. Акрамя касьцёлу, тут і клясыцыстычная Брама, фундаваная сакратаром Менскага дваранскага дэпутацкага сходу **Юр'ем Кабылінскім** у памяць аб сваёй жонцы, і шматлікія малыя архітэктурныя формы – склепы, дзе хавалі шляхту і сьвятароў.

## ЦІКАВЫ ФАКТ

**Сучасная плошча могілак складае 14 гектараў, на могілках больш за 30.000 пахаваньняў.**

# ХТО ПАХАВАНЫ НА КАЛЬВАРЫІ?

Найстарэйшы з захаваных помнікаў – чырвоны гранітны валун-піраміда сёстрам Юзэфе і Тэафіліі Амульскім з 1808 году. А ўвогуле тут спачывае ўся беларуская каталіцкая эліта Менску XIX – пач. XX ст. Тут мы бачым пахаваньні Яна Дамеля, Яна Баляслава Луцкевіча, Янкі Лучыны і роду Неслухоўскіх, Вацлава Іваноўскага. Тут знаходзяцца магілы Вайніловічаў – тых самых, дзякуючы якім у пачатку мінулага стагодзьдзя Менск упрыгожыў чырвоны касьцёл Сьв. Сымона і Алены. Тут пахаваныя Вярыгі-Дарэўскія – родзічы Арцёма Вярыгі-Дарэўскага, знакамітага беларускага пісьменьніка XIX ст. Як вядома, менскую турму на вуліцы Валадарскага пабудаваў у пачатку XIX ст. менскі мешчанін Рудольф Пішчала. У турме сядзелі паўстанцы Каліноўскага, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Якуб Колас, Алесь Гарун. А пасьля — тысячы ахвяраў сталінскага тэрору. Пішчалы таксама пахаваныя на Кальварыі. Тут і Ваньковічы (дзед знакамітага менскага мастака Валента Ваньковіча ўдзельнічаў у паўстаньні Касьцюшкі і ўваходзіў у склад ягонага ўраду).

Музыка прозьвішчаў XIX стагодзьдзя: **Аляшкевічы, Багдановічы, Багушэвічы, Булгакі, Варывоцкія, Віткевічы, Гайдукевічы, Гінтаўты, Гінцы, Грыгаровічы, Горваты, Дамброўскія, Дзейкі, Доўнары, Ельскія, Жыдовічы, Загорскія, Івашкевічы, Камоцкія, Кастравіцкія, Кімбары, Ліпніцкія, Ляўковічы, Макоўскія, Манюшкі, Матусевічы, Мрачкоўскія, Марцінкевічы, Наркевічы, Пазьнякі, Панятоўскія, Пашкевічы, Радзівілы, Рымашэўскія, Рымшы, Сабілы, Сянкевічы, Стэфановічы, Тамашэвічы, Умановічы, Філіповічы, Храптовічы, Цехановічы, Чачоты, Шунейкі, Эйсманты, Юрэвічы, Ягелы, Янушкевічы**. Чыноўнікі і настаўнікі, сьвятары, манахі і манахіні. Вайскоўцы і паўстанцы ляжаць тут побач.

Падзелу паміж пахаваньнямі арыстакратаў і звычайных месьцічаў не было, усе пахаваньні рэгістраваліся ў адной мэтрычнай кнізе, якая знаходзілася ў Катэдры. Пасьля 1917 г. амаль увесь архіў быў зьнішчаны камуністычнымі ўладамі.

Пазьней савецкія энкавэдзісты расстрэльвалі бязьвінных людзей на Кальварыйскіх могілках і ўначы закопвалі трупы ў існыя магілы. Таксама там пахаваныя: жаўнеры напалеонаўскай арміі, палонныя аўстрыйскія салдаты Першай усясьветнай вайны ("Аўстрыйская горка"), польскія жаўнеры, якія загінулі падчас савецка-польскай вайны 1919—1920 г., 3000 габрэяў зь менскага гета Другой усясьветнай вайны, савецкія салдаты (142 братнія магілы), ахвяры трагедыі на Нямізе 1999 году.

## ПАДАРОЖНІКІ ПРА КАЛЬВАРЫЮ

**Павел Шпілеўскі:** "Кальварыя, уласна рыма-каталіцкія могілкі з мураваным касьцёлам; вакол яе арэхавы лес, багаты на грыбы і розныя ягады".

# ПАКАЗЬНІК ІМЁНАЎ



**Вячаслаў Адамчык** (01.11.1933 – 05.08.2001) — беларускі празаік, драматург, кінасцэнарыст. Аўтар раманаў «Чужая бацькаўшчына», «Год нулявы», «І скажа той, хто народзіцца…», апавяданьняў «Прылёт кажана», «Ноч на Галавасека». Бацька пісьменьнікаў Адама Глёбуса і Міраслава Шайбака.
**Пахаваны:** 2 с. 1а ш. 6 м. (Падорскі)



**Алесь Асташонак** (01.06.1954 – 07.09.2004) — беларускі празаік, кінасцэнарыст, перакладнік. Аўтар кнігі прозы «Фарбы душы», п'есаў «Іскры ўначы», «Камэдыянт ці Ўзьнёсласць сумнай надзеі», сцэнароў фільмаў «Камэдыянт» і «Сон». Перакладаў на беларускую Ж. Сымэнона ды інш. Сябра згуртаваньня «Тутэйшыя».
**Пахаваны:** Калюмбарыюм. І сэктар



**Гаўрыла Віер** (07.05.1890 – 07.03.1964) — мастак, з 1905 году вучыўся і працаваў у Менску ў іканапіснай майстэрні П. Курбатава, у 1910-1912 гг. вучыўся ў Пецярбургу ў мастака С. Ягорава, скончыў там Школу таварыства заахвочваньня мастацтва (1916 г.). У 1921 г. вярнуўся ў Менск, працаваў дэкаратарам ў тэатры «Чырвоная заля», выкладаў у чыгуначным тэхнікуме і інш. Аўтар твораў «Малады мастак», «Курлоўскі расстрэл», «Лядовае пабоішча», «3 ліпеня 1944 года ў Мінску», партрэтаў З. Бядулі, К. Крапівы.
**Пахаваны:** 7 с. 28 ш. 10 м. (Салановіч)



**Яўген Гарэлік** (20.07.1938 – 6.05.2005) — беларускі журналіст, дасьледнік гістарычных падзеяў ( Другая ўсясьветная вайна, рэпрэсіі ў СССР, Курапаты). Працаваў у «Мінскай праўдзе», быў галоўным рэдактарам БелТА, кіраўніком прэс-службы Выканкаму СНД. Аўтар кніг «Куропаты: следствие продолжается» (1990, разам з Г. Тарнаўскім і В. Собалевым), «Kuropaty: polski ślad» (1996), за якую атрымаў Узнагароду імя Аляксандра Гейштара. **Пахаваны:** 5 с. 7 ш. 9а м. (Другое пахаваньне шэрагу — Рэпін)



**Ніна Гілевіч** (03.06.1931– 24.07.2003) — беларускі лінгвіст, выкладніца БДУ. Дасьледавала мову пісьменьнікаў, аўтар працаў «Таямніцы роднага слова», «Вобразнае слова Купалы», «Дыялектызмы ў прозе беларускіх пісьменнікаў» ды інш. Упершыню распрацавала курс «Асновы культуры беларускай мовы і стылістыкі». Жонка Ніла Гілевіча.
**Пахаваная:** 10а с. 4 ш. 22 м. (Лепушэнка)



**Ян Дамель** (1780—30.08.1840) – мастак, прадстаўнік мастацкай школы Віленскага ўнівэрсытэту, пакінуў значны сьлед у мастацтве Беларусі і Літвы. Аўтар партрэтаў Дамініка Радзівіла, Канстанціна Тышкевіча, гістарычных палотнаў «Павел I вызваляе Касьцюшку з турмы», рэлігійных «Маленьне Збаўцы», «Сьвятая Канстанцыя з крыжам».
Пахаваны: Пад галоўным аўтаром касьцёлу



**Пятро Драчоў** (06.07.1937—08.05.2005) – беларускі мастак, графік. Афармляў кнігі свайго сябра Ўладзімера Караткевіча, Ул. Арлова. 25 год быў мастацкім рэдактарам часопісу «Бярозка». Аўтар станкавых гравюраў «Паўстаньне 1863 году», «Кірмаш у мястэчку», шматлікіх літаграфіяў на тэмы беларускай гісторыі, ілюстрацыяў да кнігі В. Вячоркі "Пра герб і сьцяг".
**Пахаваны:** Калюмбарыюм. IV сэктар



**Вацлаў Іваноўскі** (25.05.1880—07.12.1943) – адзін з пачынальнікаў і лідэраў беларускага нацыянальнага руху ў XX ст. Заснавальнік Беларускай рэвалюцыйнай партыі, сузаснавальнік Беларускай сацыялістычнай грамады. Стварыў у Пецярбургу першае беларускае выдавецтва — суполку «Загляне сонца і ў наша ваконца», супрацоўнічаў з газэтамі «Наша доля» і «Наша ніва». Міністар асьветы ва ўрадзе Беларускай Народнай Рэспублікі, упаўнаважаны БНР на перамовах з Польшчай 1920 г. Доктар тэхнічных навук, выкладаў у Віленскім унівэрсытэце. З 1942 бурмістар Менску, загінуў у выніку замаху. **Пахаваны:** Цэнтральная алея, ля касьцёлу



**Юры Кабылінскі** (1778(?) – 04.11.1858) — сакратар Менскага дваранскага дэпутацкага сходу, літаратар, мастак, мэцэнат і калекцыянэр. Заснаваў першы ў горадзе асабісты музэй, калекцыя якога складалася з манэтаў, мінэралаў, антычных старажытнасьцяў, старых кніг і манускрыптаў, сярод якіх арыгінал Статута ВКЛ і мапа Хрыстафора Калюмба. Пасьля сьмерці Кабылінскага экспанаты перайшлі ў Віленскі музэй старажытнасьцяў. Фундатар Кальварыйскай брамы.
**Пахаваны:** Месца пахаваньня невядомае



**Генадзь Кісялёў** (19.03.1931 – 14.11.2008) — беларускі гісторык, літаратуразнавец, пісьменьнік і археограф. Дасьледаваў беларускую літаратуру і нацыянальны рух XIX ст. Аўтар зборнікаў гістарычна-літаратурных нарысаў «Сейбіты вечнага», «З думай пра Беларусь», дасьледаваньняў «Загадка беларускай «Энэіды», «Спасьцігаючы Дуніна-Марцінкевіча», літаратуразнаўчай дылёгіі «Разыскивается классик», гістарычнага нарыса «Паплечнік Каліноўскага».
**Пахаваны:** 11 с. 3 ш. 9 м.



**Яўген Кулік** (31.10.1937 – 12.01.2002) — беларускі мастак, кніжны графік, бібліяфіл. Мастацкі рэдактар часопісаў «Бярозка» і «Вясёлка». Аўтар рэканструкцыяў беларускіх замкаў, партрэтаў дзеячоў Беларушчыны. Сузаснавальнік мастацкай суполкі «Пагоня». Аўтар эталёна гербу «Пагоня» ў якасьці дзяржаўнага гербу Рэспублікі Беларусь у 1991 – 1995 г. Адзін з ідэолягаў новага беларускага Адраджэньня, лідэр нонканфармісцкага асяродку менскай інтэлігенцыі «На Паддашку», сузаснавальнік БНФ.
**Пахаваны:** 7 с. 10 ш. 37 м.



**Ян Баляслаў Луцкевіч** (15.05.1831 – 04.09.1895) — бацька Івана і Антона Луцкевічаў. Прафэсійны вайсковец, паўстанец 1863 – 1864 г., адзін зь першых прафэсійных беларускіх чыгуначнікаў. Сябра Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, які прысьвяціў яму верш «Заўтра Спаса, кажуць людзе».
**Пахаваны:** Цэнтральная алея



**Янка Лучына (Ян Неслухоўскі)** (06.07.1851 – 16.07.1897) — беларускі паэт, мысьляр, тэатральны крытык. Інжынэр-тэхноляг. Вершам «Вясновай парой» (1889) вярнуў беларускую літаратуру ў друк упершыню пасьля паўстаньня 1863 – 1864 г. Аўтар паэмы «Паляўнічыя акварэлькі з Палесься», абразка «З крывавых дзён». Каб выдаць у 1903 годзе ягоную кнігу «Вязанка» і ўнікнуць забароны на беларускамоўны друк, цэнзарам заявілі, што яна на баўгарскай мове.
**Пахаваны:** Ля касьцёлу



**Аляксандар Люцко** (23.01.1941 – 04.09.1997) — заснавальнік і першы рэктар Міжнароднага інстытуту радыеэкалёгіі імя А. Сахарава (сёньня Міжнародны дзяржаўны экалягічны ўнівэрсытэт імя А. Сахарава). Аўтар манаграфіяў, навучальных дапаможнікаў у радыяцыйнай бясьпецы. Зь ягонай ініцыятывы і пад ягоным кіраўніцтвам распрацаваная Канцэпцыя радыеэкалягічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусі.
**Пахаваны:** 1 с. 2 ш. 36 м. (Бэйшар)



**Ян Матусевіч** (21.06.1948 – 02.09.1998) — беларускі рэлігійны і грамадзкі дзяяч, сьвятар. Першы дэкан аднаўленай Беларускай Грэка-каталіцкай царквы. Ініцыятар і ўдзельнік акцыяў ушанаваньня ахвяраў сталінскага тэрору, чарнобыльскай катастрофы. Удзельнік устаноўчага зьезду БНФ «Адраджэньне», сябра Рады Таварыства беларускай мовы ад моманту заснаваньня. Асьвяціў усталяваны ў Курапатах Крыж памяці ахвяраў бальшавізму і абраз Маці Божай Чарнобыльскай. Сузаснавальнік Беларускага біблійнага таварыства.
**Пахаваны:** 2 с. 8 ш. 15 м. (Акуліч)



**Іван Навуменка** (16.02.1925 – 17.12.2006) — народны пісьменьнік Беларусі, літаратуразнавец. Акадэмік АН БССР, доктар філялягічных навук, прафэсар. Аўтар раманаў «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах», «Сорак трэці». Старшыня ВС БССР (1985 – 1990).
**Пахаваны:** 2 с. 8 ш. 20 м. (Акуліч)



**Канстанцін Палікарповіч** (06.03.1889 – 20.02.1963) — археоляг. З 1926 чалец гістарычна-археалягічнай камісіі Інбелкульту. Адкрыў і вывучаў палеалітычныя і мэзалітычныя стаянкі, помнікі нэаліту і бронзавага веку. Выяўляў новыя помнікі на Бесядзі, Дняпры, Іпуці... Вывучаў касьцярэзнае мастацтва першабытных людзей і менскія старажытнасьці.
**Пахаваны:** 5 с. 22 ш. 13 м. (безыменная магіла ў агароджы, 21 ш. – Дзьмітрыева)



**Алесь Пісьмянкоў** (25.02.1957 – 23.04.2004) — беларускі паэт, эсэіст, перакладнік. Працаваў у часопісах «Літаратура і мастацтва», «Полымя», «Вожык». Аўтар кніг паэзіі «Белы камень», «Чытаю зоры», «Планіда», «Вершы», «Жураўель над студняй».
**Пахаваны:** 1 с. 42 ш. 15а м. (Дзядзечкін)



**Аляксандар Сіпайла** (1854 – 1886) — каталіцкі сьвятар, пробашч катэдральнага касьцёлу імя Найсьвяцейшай Панны Марыі ў Менску. Працаваў у цяжкі для Касьцёлу час пасьля задушэньня паўстаньня 1863—1864 г. У памяць пра ягоную самаадданую працу людзі паставілі помнік з надпісам: «Сьвятога жыцьця ня многа дзён, а добрая слава жыць будзе вечна». **Пахаваны:** Ля касьцёлу.



**Галіна Сяржаніна** (17.10.1930 – 22.05.2008) — навуковец-біёляг, аўтарка шэрагу навуковых выданьняў, суаўтарка беларускамоўнага энцыкляпэдычнага даведніка «Грыбы і грыбная кулінарыя». **Пахаваная:** 8 с. 35 ш. 15 м. (Зайцавы)

**Алесь Траяноўскі** (22.09.1925, Уздымач на Случчыне – 18.03.2005 ) — беларускі пісьменьнік, літаратуразнаўца, перакладнік з славянскіх моваў. Пачынальнік беларуска-сэрбалужыцкіх кантактаў. Кіраваў аддзелам літаратуры і мастацтва ў «Зьвязьдзе», быў намесьнікам рэдактара часопіса «Мастацтва Беларусі», рэдактарам аднаўленай «Беларускай крыніцы».
**Пахаваны:** каля сьцяны ў куце 6 сэктару.

**(Падорскі) — першае пахаваньне ў шэрагу**

**С – сэктар**
**Ш – шэраг**
**М – месца**